Парламенцкі дзённік

КАЗКА Ў ГАСЦЯХ У НАС

Данія зацікаўленая ў супрацоўніцтве з Беларуссю — як на эканамічным, так і на палітычным узроўні

Дацкія парламентарыі гэтымі днямі знаёміцца з Беларуссю. Іх перамовы з беларускімі калегамі прайшлі калі не ў казачнай, то ў досыць пазітыўнай танальнасці. **Віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў Віктар ГУМІНСКІ** выразіў задаволенасць з той нагоды, што паміж двума парламентамі склаліся добрыя адносіны. На думку палітыка, так і павінна быць, бо абедзве краіны знаходзяцца ў рэгіёне Балтыйскага мора і маюць шмат агульных інтарэсаў. Асаблівую падзяку віцэ-спікер выразіў за падтрымку, аказаную падчас 18-й Парламенцкай канферэнцыі Балтыйскага мора ў Нюрнбергу.

— Ад асобных еўрапейскіх дэпутатаў гучалі прапановы па ўключэнні ў склад беларускай дэлегацыі і прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці. Дацкі парламент заняў прынцыповую пазіцыю, што будзе весці дыялог толькі з парламентам Беларусі. І мы гэта вельмі шануем, — прызнаецца беларускі палітык.

Удзячныя парламентарыі і за падтрымку датчанамі беларускай рэзалюцыі па чарнобыльскім пытанні ў ПА АБСЕ, а таксама беларускай заяўкі на атрыманне статусу назіральніка ў Савеце дзяржаў Балтыйскага мора.

— У нас існуе ўзаемапавага, раўнапраўны падыход да цэлага шэрагу пытанняў, — рэзюмуе В. Гумінскі.

А бягучы візіт, паводле яго чаканняў, паспрыяе ўмацаванню не толькі міжпарламенцкіх сувязяў, але і двухбаковых адносінаў у цэлым.

— Каралеўства Данія — эканамічна развітая дзяржава, аднак мы спадзяёмся, вы зможаце пераканацца, што і Беларусь многае зрабіла ў сваім эканамічным развіцці. Пабачыце, як жыве беларускі народ, і ў вас, спадзяёмся, сфарміруецца аб'ектыўная ацэнка таго, што тут адбываецца.

Кіраўнік дэлегацыі, старшыня Камітэта дацкага парламента па знешняй палітыцы, Ева К'ер ХАНСЕН акцэнтавала адкрытасць да ўзаемадзеяння. І словам госці з радзімы казак так хочацца верыць.

— Мы зацікаўленыя ва ўзаемавыгадных, суседскіх (паколькі Беларусь мяжуе з краінамі ЕС) адносінах з Беларуссю, пашырэнні нашага супрацоўніцтва не толькі ў сферы бізнэсу і гандлю, але і на палітычным узроўні.

Сустрэчы на парламенцкім, а таксама іншых узроўнях, на яе думку, вельмі важныя: яны садзейнічаюць паглыбленню супрацоўніцтва і ў выніку — паляпшэнню жыцця людзей.

— Мы зацікаўленыя ў любой інфармацыі пра вашу краіну, — адзначае кіраўнік Камітэта, з якім дацкі ўрад кансультуецца па пытаннях знешняй палітыкі, і тут жа ўдакладняе, што найбольшы інтарэс уяўляюць звесткі пра кантакты Беларусі з міжнароднымі ўтварэннямі (у прыватнасці, з Паўночным Саветам, ЕС), а таксама пра тое, як тут прымаюцца рашэнні...

Ала МАЧАЛАВА.

Блізкая ўлада

АДКРЫТАЯ РАЗМОВА ПРА НАБАЛЕЛАЕ

СТАРШЫНЯ Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР сустрэўся з калектывам Баранавіцкага вытворчага бавоўнянага аб'яднання. У сустрэчы прыняў удзел і старшыня канцэрна «Беллегпрам» Генадзь ВЫРКО.

Сітуацыя на прадпрыемстве складаная. Рэнтабельнасць нулявая. Запасы прадукцыі выраслі да 23 млрд рублёў. БВБА засталося без сыравіны і абаротных сродкаў.

Кіраўнік вобласці лічыць, што адказнасць за такі стан спраў нясе кіраўніцтва прадпрыемства. Ён звярнуў увагу на той факт, што нават у Брэсце аб'яднанне не мае сваёй крамы, а на ўсю краіну ў прадпрыемства ўсяго дзве фірмовыя крамы.

У аб'яднанні новы генеральны дырэктар — Іван Турчак, які да гэтага ўзначальваў камбінат надомнай працы. Дзяржава ўжо ўклала ў бавоўнянае аб'яднанне 90 млрд рублёў, але прадпрыемству патрэбна далейшая падтрымка. Дэбіторская запазычанасць БВБА хутка дасягне 30 млрд рублёў. І гэта пры тым, што склады прадпрыемства запоўненыя тканінай даволі добрай якасці. Калі б удалося рэалізаваць прадукцыю, то эканамічная сітуацыя ў тэкстыльшчыкаў значна палепшылася б.

Кіраўнік канцэрна Генадзь Вырко заявіў, што бавоўна будзе закупляцца цэнтралізавана, а гэта дасць магчымасць знізіць цану на сыравіну. Для мадэрнізацыі вытворчасці канцэрн выдзеліць БВБА 160 млрд рублёў.

— Але пры любой падтрымцы прадукцыя не павінна ляжаць на складах, — падкрэсліў старшыня «Беллегпрама».

Падчас сустрэчы з тэкстыльшчыкамі кіраўнік Брэсцкага аблвыканкама К. Сумар закрануў і іншыя праблемы горада.

Ён звярнуў увагу на тое, што Лядовы палац у Баранавічах стратны.

— Неабходна выправіць сітуацыю. У вобласці ўсе спартыўныя комплексы ўжо сябе акупляюць, — заявіў кіраўнік Брэстчыны, — а яшчэ мы павінны асвоіць 240 млрд рублёў, якія выдзелены на будаўніцтва воднага спартыўнага комплексу.

Старшыні аблвыканкама задалі пытанне наконт правядзення абласных «Дажынак» у Баранавічах.

Канстанцін Сумар не супраць таго, каб у наступнай пяцігодцы «Дажынкі» прайшлі ў Баранавічах, і адзначыў, што гэтае мерапрыемства хоць і прыемнае, але дарагое. Сёлета абласное свята ўраджаю ў Маларыце абыдзецца вобласці ў 140 млрд рублёў. А абласны бюджэт мае мяжу. Вось выдзелены грошы на прывядзенне ў парадак вуліц Шаўчэнкі і Уральскай, а яшчэ неабходна знайсці сродкі для таго, каб адрамантаваць гінекалагічнае аддзяленне радзільнага дома, знайсці грошы на будаўніцтва дзіцячага сада ў новым мікрараёне Бараўкі...

Гаворка ішла не толькі пра праблемы, але і пра тое, што зроблена ў горадзе і вобласці. За пяцігодку на Брэстчыне было пабудавана больш за тры мільёны квадратных метраў жылля. У вобласці створаны ўсе ўмовы для прадпрымальніцтва: сёння кожны шосты жыхар Брэстчыны працуе ў прыватным сектары.

Добра, што размова атрымалася шчырай.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

БЕЛАРУСКУЮ МОВУ НАЗВАЛІ РОДНАЙ 60 ПРАЦЭНТАЎ ЖЫХАРОЎ РЭСПУБЛІКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аднак, падкрэсліла Алена Кухарэвіч, у структуры непрацаздольнага насельніцтва зніжаецца колькасць людзей маладзейшых за працаздольны ўзрост, якія ў будучым маглі б папоўніць рады працуючых. Паводле даных перапісу насельніцтва 1970 года, на 1000 чалавек у працаздольным узросце прыпадала 586 дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, у 1979 годзе — 429 чалавек, у 1989-м — 437, у 1999-м — 371, а ў 2009 годзе на 1000 працаздольных прыпадала толькі 258 дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў. Доля жанчын старэйшых за працаздольны ўзрост складае 30 працэнтаў, мужчын — 14 працэнтаў у агульнай колькасці асобаў гэтага полу.

Работа — асноўная крыніца сродкаў існавання для 45 працэнтаў жыхароў Беларусі. Работу ў якасці асноўнай крыніцы сродкаў існавання назвалі 4 млн 255 тыс. чалавек, а сярод насельніцтва ў працаздольным узросце жывуць за кошт работы каля 70 працэнтаў рэспандэнтаў.

Стыпендыю, пенсію, дапамогу, іншы від дзяржаўнага забеспячэння лічаць сваёй асноўнай крыніцай сродкаў існавання 27 працэнтаў жыхароў краіны. Сярод сельскіх жыхароў іх доля перавышае 36 працэнтаў, што звязана з узроставай структурай сельскага насельніцтва. На ўтрыманні знаходзіцца 23 працэнты насельніцтва краіны, з іх амаль 90 працэнтаў — моладзь да 25 гадоў. Яшчэ 5 працэнтаў жыхароў Беларусі маюць іншыя крыніцы папаўнення свайго бюджэту.

З агульнай колькасці насельніцтва краіны адну крыніцу сродкаў існавання адзначылі 8 млн 201 тыс. чалавек (86 працэнтаў), дзве крыніцы — 1 млн 90 тыс. чалавек (11 працэнтаў). Пры правядзенні перапісу ўлічваліся крыніцы, як у грашовай, так і ў натуральнай форме, якія былі ў рэспандэнтаў у 2009 годзе.

За дзесяцігоддзе доля насельніцтва Беларусі, старэйшага за працаздольны ўзрост, павялічылася, а доля насельніцтва, маладзейшага за працаздольны ўзрост, зменшылася. Так, калі па выніках папярэдняга перапісу насельніцтва, які адбыўся ў 1999 годзе, людзей старэйшых узростаў было 21,5 працэнта ў агульнай колькасці жыхароў краіны, то па выніках перапісу 2009 года — ужо 22,5 працэнта. А ўдзельная вага насельніцтва, маладзейшага за працаздольны ўзрост, знізілася з 21,2 працэнта ад 15,9 працэнта адпаведна.

За 10 гадоў пасля перапісу 1999 года колькасць дзяцей у цэлым па рэспубліцы зменшылася на 620 тыс. чалавек (амаль на 30 працэнтаў), у тым ліку ў сельскай мясцовасці — на 37,6 працэнта. Такое значнае скарачэнне колькасці дзяцей звязана з падзеннем нараджальнасці ў 90-х гадах, што асабліва адбілася на дынаміцы ўзроставай групы 10—14 гадоў. За міжперапісны перыяд колькасць дзяцей у гэтым узросце зменшылася ў 1,7 раза. У кастрычніку мінулага года ў найбольш актыўным дзетародным узросце 20—34 гады знаходзіліся на 39 тыс. жанчын больш, чым у 1999 годзе, а іх удзельная вага павялічылася з 19,7 працэнта да 21,4 працэнта.

Што датычыцца жыхароў краіны ў працаздольным узросце, то іх доля ў агульнай колькасці насельніцтва Беларусі павялічылася з 57,3 працэнта ў 1999 годзе да 61,6 працэнта ў 2009 годзе. Гэты паказчык прадстаўнік Белстата лічыць высокім. Колькасць насельніцтва ў працаздольным узросце на момант перапісу склала 5 млн 853 тыс. чалавек — гэта амаль на 2 працэнты больш (больш як на 100 тыс. чалавек) у параўнанні з данымі перапісу насельніцтва 1999 года.

Алена Кухарэвіч падкрэсліла, што для Беларусі, як і для іншых еўрапейскіх краін, характэрны працэс старэння насельніцтва. Гэта выяўляецца ў паступовым павелічэнні долі старэйшых узроставых груп (65 гадоў і старэйшых) ва ўзроставай структуры насельніцтва. У адпаведнасці з класіфікацыяй ААН, насельніцтва лічыцца старым, калі ўдзельная вага людзей ва ўзросце 65 гадоў і старэйшых складае 7 працэнтаў і больш. Паводле даных перапісу 2009 года, у цэлым па краіне гэты паказчык перасягнуў 14 працэнтаў, у структуры сельскага насельніцтва ён наблізіўся да 23 працэнтаў.

28 тыс. жыхароў Беларусі, або 0,3 працэнта насельніцтва, адмовіліся ад удзелу ў перапісе. Людзі адмаўляліся адказваць на пытанні перапісных лістоў у асноўным па рэлігійных меркаваннях.

Алена Кухарэвіч падкрэсліла, што атрыманыя ў ходзе перапісу насельніцтва звесткі — якасныя, аб'ектыўныя і дакладныя. Інфармацыя, якая характарызуе эканамічную актыўнасць насельніцтва, знаходзіцца ў распрацоўцы. Белстат завершыць яе ў пачатку лютага наступнага года.

МІНСК ЗАПРАШАЕ НА «САЛОДКІ» ФЕСТЫВАЛЬ

11 верасня ў Мінску пройдзе першы кандытарскі фестываль «Асалодкі — 2010». Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміла прэс-сакратар канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Ірына Гусева. «Салодкае свята» пачнецца ў 10 гадзін на пляцоўцы каля Палацу спорту, і там жа а 13 гадзіне адбудзецца буйное прадстаўленне. Пры гэтым госці фестывалю змогуць пабачыць канцэрт, паўдзельнічаць у шматлікіх конкурсах (напрыклад, па з'яданні шакаладак на хуткасць), пагадаць на цукерках, пабачыць касцюмы з цукерачных фанцікаў, пагуляць пад цукерачнымі, зефірнымі і шакаладнымі дрэвамі, а таксама пакаштаваць (і абавязкова набыць!) прадукцыю беларускіх кандытараў. Дарэчы, чакаецца, што ўдзел у «Асалодках — 2010» возьмуць практычна ўсе айчынныя вытворцы, і ў тым ліку «Камунарка», «Спартак», «Слодыч», «Чырвоны харчавік», «Чырвоны Мазыранін», «Конфа» і «Першая шакаладная кампанія».

Сяргей ГРЫБ.

Ні даць, ні ўзяць... не паспелі

У кватэры дома па вуліцы Маскоўскай у Брэсце затрымалі службовую асобу транспартнага прадпрыемства. Тут мелася адбыцца перадача хабару за выдачу дазволу на выкананне пасажырскіх перавозак. Як паведамілі ў прэс-службе абласнога ўпраўлення УС, менавіта гэтая службовая асоба схіляла зацікаўленых людзей да дачы хабару. Цяпер ва ўсім будзе разбірацца следства.

Яна СВЕТАВА.

Абзац

80 гадоў з дня нараджэння Юрыя Гуляева — спевака, народнага артыста СССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР.

Гаспадаркі Беларусі, па звестках на ўчарашні дзень, убралі грэчку на 10,6 тыс.га, што складае 30,6 % засеяных плошчаў. Намалочана 11,7 тыс. т зерня, ураджайнасць складае 11,1 ц/га. Самая высокая ўраджайнасць у Гродзенскім рэгіёне — 16,3 ц/га.

Віцебскі гарвыканкам задаволіў шматлікія просьбы жыхароў Віцебска і забараніў гандаль гарэлкай і півам з 23 да 8 гадзін у крамах, якія працуюць кругласутачна. Рашэнне мясцовай улады ўступіла ў сілу. Пасля прыняцця такога рашэння колькасць крамаў з кругласутачным рэжымам працы ў абласным цэнтры скарацілася з 8 да 3. У адным з магазінаў, якія засталіся, з 23 да 8 гадзін забараняецца рэалізацыя спіртовых напояў і піва, у двух другіх — продаж гарэлкі па фіксаваных коштах і піва.

Мэр Мінска збіраецца выселіць кракадзілаў са сталічных кватэр. Старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька лічыць магчымым пераглядзець у бок большай строгасці правілы ўтрымання ў кватэрах шматпавярховых дамоў хатняй жывёлы для забеспячэння бяспекі грамадзянаў. Як чакаецца, у хуткім часе будзе прынятае адпаведнае рашэнне. Уладальнікі ўсякай жыўнасці павінны ўлічваць нормы супольнага жыцця і не парушаць правілаў утрымання хатніх пітомцаў. «Вось калі ў кватэры паверхам вышэй жыве, скажам, ядавітая змяя альбо кракадзіл, то гэта выклікае ў чалавека пэўны непакой, хоць напрамую ён з гэтым кракадзілам не кантактуе. Але непакой ёсць, паколькі існуе магчымасць пагрозы», — сказаў М. Ладуцька.

Супрацоўнік міліцыі падчас палявання ў Краснапольскім раёне па неасцярожнасці забіў таварыша. Супрацоўнік Краснапольскага РАУС разам з працаўнікам адміністрацыі зонаў адчужэння і адсялення па гэтым раёне незаконна палявалі на дзіка паблізу вёскі Палуж-1. Міліцыянер, які памылкова прыняў таварыша за звера, прычыніў са свайго зарэгістраванага паляўнічага ружжа смяротнае агнястрэльнае раненне. Заведзена крымінальная справа.

У Івацэвічах электрацягнікам траўмаваны 18-гадовы хлопец. Няшчасны выпадак здарыўся 7 верасня ў 23.26 на чыгуначнай станцыі «Івацэвічы». Малады чалавек, які знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення, упаў з перона перад электрычкай «Брэст — Мінск». Юнак, навучэнец Баранавіцкага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя будаўнікоў, з траўматычнай ампутацыяй ног змешчаны ў рэанімацыйнае аддзяленне Івацэвіцкай бальніцы. Пацярпеламу зроблена аперацыя, яго стан цяжкі.

Партыя нелегальна перавозімых жывых кветак на Br344 млн канфіскаваная супрацоўнікамі аператыўна-пошукавага аддзела Віцебскай мытні ў Дубровенскім раёне. Ружы і хрызантэмы перавозіліся з Германіі ў Расію на грузавым аўтамабілі DAF, якім кіраваў расійскі грамадзянін. У ходзе дагляду мытнікі выявілі перавышэнне колькасці заяўленага тавару больш чым на 47 тыс. адзінак. Пачаты адміністрацыйны працэс. Так як тавар хутка псуецца, то кветкі паступілі ў спецыялізаваныя гандлёвыя арганізацыі вобласці.

Сапраўдную кобру злавілі ўчора выратавальнікі ў самым цэнтры Мінска. Заўважылі змяю мінакі па вуліцы Веры Харужай. Кобра паўзла па лесвіцы, а людзі здымалі яе на камеры мабільных тэлефонаў. Супрацоўнікам МНС давялося шмат папрацаваць, каб злавіць змяю. Яе даўжыня не перавышае метра, але яна вельмі небяспечная. Выратавальнікі перадалі знаходку супрацоўнікам заапарка. Як змяя з'явілася на ганку крамы — невядома. Гэта трэці выпадак літаральна за месяц, гавораць выратавальнікі. Першыя дзве змяі былі бясшкодныя для людзей.

Поўны абзац

Расійскія прыставы арыштавалі за даўгі акварыумных рыбак жыхара Башкартастана, які не змог вярнуць банку буйную суму грошай. У загарадным доме ўфімца прыставы выявілі акварыум з імітацыяй марскога дна, які быў уманціраваны ў сцяну. Эксперты вызначылі, што сярод рыбак аказаліся вельмі рэдкія віды. Зараз рыбкі знаходзяцца на захаванні ў спецыялістаў. Іх прададуць, а вырučаныя грошы пойдуць у лік пагашэння доўгу. Раней у такіх выпадках арышт накладваўся толькі на дробную і буйную рагатую жывёлу, а таксама пчолаў.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ЧАГО БЫЛО ЛЕЗЦІ?

З пячной трубы зернесушыльнага комплексу ў вёсцы В. Якавічы Пружанскага раёна ўпаў чалавек і забіўся.

Што там рабіў 23-гадовы непрацуючы жыхар суседніх Арабнікаў, высвятляе зараз пракуратура.

Яна СВЕТАВА.

Дзве даты — 9 верасня

1815 год — у сям'і прыходскага святара Мінскай губерні нарадзіўся Іосіф Антонавіч Гашкевіч, вядомы дыпламат, навукоўца-мовазнаўца, даследчык Далёкага Усходу, натураліст. Скончыў Мінскую, затым Пецярбургскую духоўныя семінарыі. Вывучаў кітайскую, карэйскую, японскую, англійскую, нямецкую, французскую, лацінскую, грэчаскую і іншыя мовы, даследаваў культуру і філасофію Кітая і Японіі. У 1854 годзе з яго ўдзелам заключаны Сімодскі трактат — першы руска-японскі дагавор, які паклаў пачатак двухбаковым дыпламатычным і гандлёвым адносінам. У 1858-65 гадах быў першым расійскім консулам у Японіі. Першы замежнік, якому было дазволена выехаць за межы японскай сталіцы і здзейсніць вандраванне па краіне. З 1867 года — у адстаўцы, жыў у маёнтку Малі (цяпер вёска ў Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці). Выдадзены ім першы ў Расіі «Японска-рускі слоўнік» адзначаны медалём Пецярбургскай АН і Дзямідаўскай прэміяй. Аўтар работы «Карані японскай мовы». Калекцыі флоры і фаўны Паўднёвай Афрыкі, сабраныя падчас вандраванняў, перадаў заалагічнаму музею АН у Пецярбургу. Памёр у 1875 годзе.

1776 год — зацверджана новая назва Аб'яднаных Калоній Амерыкі — Злучаныя Штаты Амерыкі.

Цытата дня

«Мары слабых — уцёкі ад рэчаіснасці; мары моцных людзей фарміруюць рэчаіснасць».

Юзэф Бестэр.

Футбол

Бернд ШТАНГЕ:

«Румыны радаваліся гэтаму ачку»

Нацыянальная каманда лідзіруе ў групе D, моладзевая зборная прабілася ў плэй-оф чэмпіянату Еўропы

Наша нацыянальная каманда і моладзевая зборная правялі чарговыя матчы адбору да чэмпіянатаў Еўропы 2012 і 2011. Цуда, якога чакалі балельшчыкі ад галоўнай каманды, не выйшла: у другога пасля Францыі фаварыта групы, румынаў, адабраць тры ачкі не атрымалася. Аднак хоць спадзяванні нашы былі звязаныя з перамогай, мы ведаем, яе лёгка маглі і прайграць. Супернік быў не з простых — сяміразовы ўдзельнік чэмпіянатаў свету і чатырохразовы — чэмпіянатаў Еўропы, у 1994 годзе румыны станавіліся чвэрцьфіналістам чэмпіянату свету, у 2000-м — чвэрцьфіналістам чэмпіянату Еўропы. Так што нічыя — прымальны вынік. Затое моладзевая каманда, выйграўшы ў равеснікаў з Азербайджана, з 17 ачкамі заняла другое месца ў сваёй групе. А пасля заканчэння ўсіх матчаў у астатніх групах стала вядома, што нашы футбалісты ў ліку чатырох лепшых каманд, якія занялі другія месцы, праходзяць у плэй-оф чэмпіянату Еўропы!

Водгаласам перамогі ў Парыжы быў і амаль поўны стадыён «Дынама» (тысяч трыццаць балельшчыкаў запоўнілі трыбуны), і народны ансамбль, удзельнікі якога ў нацыянальных касцюмах прама на ўваходзе сустракалі балельшчыкаў і запрашалі патанчыць, і ўся шоу-праграма з беларускімі артыстамі перад матчам. Але нашы футбалісты так і не змаглі ні разу за матч трапіць у створ варот. Самым небяспечным момантам ля варот суперніка быў бадай што выхад адзін на адзін з варатарам Сяргея Карніленкі на 8-й хвіліне і яго ўдар з вострага вугла. Ускалыхнулася сетка, стадыён падскочыў, гатовы ўзарвацца авацыямі... Але хутка стала зразумела, што мяч трапіў у знешнюю сценку варот. Сяргей Кісляк, які выйшаў цяпер у стартавым складзе, некалькі разоў таксама імкнуўся паразіць вароты з дальніх дыстанцый, аднак дарэмна. Аляксандр Глеб выдатна абыгрываў сваіх візаві, пасаваў брату, у якога у гэтай гульні атрымлівалася не так гладка, як у Парыжы. Глеб-старэйшы, дарэчы, атрымаў у матчы траўму, таму ў бліжэйшай гульні за англійскі «Бірмінгем» на поле не выйдзе. Падключаліся да атак крайнія абаронцы Шытаў і Юрэвіч, аднак і гэта вынікаў не прыносіла.

Добра таксама тое, што не ўсё атрымлівалася ў румынаў. Момантаў, трэба аддаць ім належнае, у гасцей было куды больш. Але наш галкіпер Жаўноў здолеў захаваць вароты ў недатыкальнасці, за што адзін са спонсараў абяцаў падарыць яму і Кісляку, які забіваў французам, электронныя кнігі «Прэстыжыя».

Пасля матчу Рэзван Лучэску, трэнер румынскай зборнай, так і сказаў, што яго падапечныя заслугоўвалі перамогі, але не хапіла ўдачы. Бернд Штанге не пагадзіўся:

— Ні адна з каманд у гэтым матчы не дастойная перамогі. Гульня была роўнай. Мы надта не рызыкавалі, бо ведалі, як румыны могуць контратакаваць. Мы павінны паляпшаць свае навыкі ў камбінацыйным футболе.

Увогуле ж нямецкі спецыяліст адзначыў, што за дзве стартавыя гульні наша зборная заслугоўвае толькі кампліментаў.

— Гэта добры пачатак кваліфікацыі. Я бачыў, як радаваліся румыны гэтаму ачку, і тут можна зрабіць выснову, што ў нас моцная каманда. Пасля гэтых матчаў можна сказаць, што наша мэта — заняць у групе першае месца.

Хоць і разлічвала наша каманда на перамогу, нічыёй гер Штанге не расстроены:

— У любым выпадку лічу, што ачко мы набылі, а не страцілі два. Лічыце, што ў Францыі мы згулялі ўнічыю, а тут выйгралі... Калі б да пачатку кваліфікацыі мне сказалі, што ў двух стартавых матчах мы атрымаем чатыры ачкі, я адразу б пагадзіўся...

І сапраўды, цяпер у нашай групе першыя месцы пасля двух матчаў займае Албанія і Беларусь, а не фаварыты Францыя і Румынія. У кастрычніку нас чакаюць матчы ў Люксембургу і ў Магілёве супраць Албаніі.

Гульня з Азербайджанам стала няпростай для нашай моладзевай каманды. Першы тайм скончыўся ўнічыю, і гэта не давала ніякіх падстаў для выхаду ў плэй-оф. Толькі на 76-й хвіліне Паўлу Няхайчыку ўдалося вывесці нашу каманду наперад, чым ён і заслужыў кампліментаў галоўнага трэнера Георгія Кандрацьева:

— Няхайчык і выцягнуў гэты матч. Столькі браку я яшчэ не бачыў. Напэўна, гэта наша першая гульня з такой колькасцю памылак. Вядома, матч далёка не лепшы, але лепш выйграць пры дрэннай гульні, чым прайграць з добрай. Мы дасягнулі выніку і ідзём далей. Хлопцы ў раздзявальні радуюцца. Зразумела, што перад матчам перахвальваліся. Яны вельмі хацелі выйграць, а супернік выйшаў гуляць у сваё задавальненне. Але пераможцаў не судзяць, — заявіў Георгій Кандрацьеў.

Будзем хварэць за нашых футбалістаў і спадзявацца, што ў стыкавых матчах, дзе супернікамі беларусаў могуць быць каманды Англіі, Іспаніі і Ісландыі (жараб'ёўка пройдзе ў пятніцу, 10 верасня), ім будзе спадарожнічаць удача.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАСАЖЫРЫ ТУ-154 ЦУДАМ ЗАСТАЛІСЯ ЖЫВЫЯ

Пасажырскі самалёт Ту-154 авіякампаніі «Алроса», які ляцеў з Якуціі ў Маскву, раніцай 7 верасня здзейсніў аварыйную пасадку на вайсковым аэрадроме ў Комі.

На борце паветранага судна знаходзіліся дзевяць членаў экіпажа і 72 пасажыры, у тым ліку дзеці. Пасля вылету з аэрапорта «Палярны» ў Якуціі на вышыні больш за 10 кіламетраў на борце самалёта адмовіла сістэма электрасілкавання, а таксама абсталяванне навігацыі і радыёсувязі. Пасля зніжэння высветлілася, што расходны паліўны бак перастаў напаўняцца з-за адмовы электрапомпаў. Аварыйная пасадка была зроблена на паласу вайсковага аэрадрома ў Іжме, не прыстасаваную для цяжкіх паветраных суднаў. Па словах членаў экіпажа, гэтая паласа выкарыстоўваецца як верталётная пляцоўка. Акрамя таго, з-за адмовы электрапрывадаў не былі выпушчаныя перадкрылкі і закрылкі лайнера, з-за чаго пасадку прыйшлося праводзіць на павышанай хуткасці. Тым не менш ніхто не пацярпеў, а самалёт атрымаў толькі нязначныя пашкоджанні. З-за недахопу месцаў у гасцініцы пасажыраў размясцілі ў мясцовым спарткомплексе.

ЗАБАСТОЎКА Ў ФРАНЦЫІ САБРАЛА 2,5 МІЛЬЁНА ЧАЛАВЕК



У другі дзень агульнанацыянальнай забастоўкі, пачатай у Францыі 6 верасня, пратэстуючым удалося вывесці на вуліцы па ўсёй краіне 2,5 мільёна чалавек.

Афіцыйныя ацэнкі колькасці забастоўшчыкаў былі істотна больш сціплымі, чым у прафсаюзаў.

Прайшоўшыя выступленні павінны былі выліцца ў адмену ў краіне паловы рэйсаў на чыгунцы, скарачэнне каля 25 % авіярэйсаў міжнародных перавозчыкаў у Парыжы, а таксама сур'ёзна ўскладніць працу парыжскага метро. Прычынай забастоўкі стаў план урада краіны павялічыць пенсійны ўзрост з 60 да 62 гадоў. Французскі прэзідэнт Нікаля Сарказі заяўляў, што лічыць пенсійны законапраект «абсалютным прыярытэтам», нягледзячы на тое, што ён быў негатыўна сустрэты лідарамі прафсаюзаў.

МЯДЗВЕДЗЬ ЗБІРАЕЦЦА Ў ПРЭМ'ЕРЫ ЛАТВІІ



На пост прэм'ер-міністра Латвіі вылучаны незвычайны кандыдат. Гэта белы паралонавы мядзведзь, якога Апошняя партыя прапаноўвае зрабіць кіраўніком кабінета міністраў краіны.

«Апошняя партыя ў якасці свайго кандыдата на пост прэм'ер-міністра Латвіі высунула Мядзведзя шчасця, персанажа п'есы Андрэя Упітса (вядомы латышскі пісьменнік)», — сказаў старшыня партыі Гінтс Кнокс. Палітык дадаў, што мядзведзь — «шырока вядомая культурная асоба, якая дала адукацыю некалькім пакаленням латвійцаў». Прадстаўнікі партыі ўжо зрабілі з паралону двухметровую постаць Мядзведзя шчасця і спадзяюцца, што выбаршчыкі яго падтрымаюць. Мяркуецца, што ў адкрыты рот клышаногага выбаршчыкі будуць кідаць пажаданні, якія ён «прыме блізка да сэрца». Цэнтральная выбарчая камісіі Латвіі пакуль ніяк не пракаментавала кандыдатуру паралонавага мядзведзя. Самі ж выбары ў Сойм Латвіі пройдуць у рэспубліцы 2 кастрычніка.

Апошняя партыя была заснаваная ў чэрвені 2010 года, каб выкрываць папулізм палітычных сілаў, якія змешчаныя ва ўладзе. У якасці дэвізу члены партыі абралі распаўсюджаны адказ на пытанне аб палітычных перавагах — «Не ведаю, не вырашыў».

МАСКОЎСКІ СЛУЖБОВЕЦ ПААБЯЦАЎ ЗАЧЫНІЦЬ СТАНЦЫЮ «БЕЛАРУСКАЯ»

Кіраўнік дэпартамента транспарту і сувязі горада Масква Васіль Кічэджы расказаў журналістам аб магчымым зачыненні станцыі Маскоўскага метрапалітэна «Беларуская» — як Кольцавай, так і Замаскварэцкай ліній, паведамляе РІА Навіны. З чым звязаныя такія планы, службовец не патлумачыў.

Паводле слоў Кічэджы, нічога сакрэтнага ў магчымым зачыненні няма: «Выпусцім пастанову ўрада, вы аб усім даведаецеся». Службовец удакладніў, што станцыя можа быць зачыненая ў 2011 годзе, аднак не растлумачыў, на які тэрмін. Пераход паміж радыяльнай і кольцавай станцыямі «Беларуская» зачынены з мая 2010 года. Гэта было зроблена для замены эскалатараў. Чакаецца, што пераход адкрыецца зноў да канца года. Акрамя гэтага, раней паведамлялася, што «Беларускую» плануецца абсталяваць датчыкамі радыехімічнага кантролю.

Минский районный исполнительный комитет 21 сентября 2010 г. повторно проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

		Лот 1
1	Адрес земельного участка	Боровлянский с/с, д. Дроздово, У-77
2	Кадастровый номер	623680602601000846
3	Площадь земельного участка	0,1489 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 320 260
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	95 000 000
7	Задаток (рублей)	9 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 21.09.2010 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов – 15.09.2010 г. Контактные телефоны: 204 11 62, 204 35 25.

Задаток на участие в аукционе перечисляется на расчетный счет Боровлянского сельисполкома № 3600621010037 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал АСБ «Беларусбанк», ул. Карбышева, 13/2, г. Минск, УНП 600052345, код платежа 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта).

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»

220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А
режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00,
тел.: 227 44 76, 227 65 53

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2009 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-3. Жилой дом № 14 (по генплану)» в г. Минске.

Свидетельство (удостоверение) № 500/962-1762 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права собственности на него от 15.10.2009 г.

Земельный участок площадью 0,0855 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома – 23-этажное, односекционное. Количество жилых помещений жилого дома – 132. Серия жилого дома – индивидуальная.

Начало строительства – октябрь 2009 года.

Окончание строительства в соответствии с ПОС – апрель 2011 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 26.05.2009 № 1165-5/09.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться на строительство офисных помещений: № 1– площадью 70,6 $м^2$, № 2 – площадью 70,53 $м^2$, магазина № 1 – площадью 87,94 $м^2$, магазина № 2 – площадью 93,99 $м^2$.

Предметом договора будет являться строительство нежилых помещений.

Стоимость строительства 1 кв. метра площади по экспликации нежилых помещений без учета выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет: офисное помещение № 1 – 5158460 руб.; офисное помещение № 2 – 5179760 руб.; магазин № 1 – 5154660 руб.; магазин № 2 – 5155640 руб.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 16.09.2009 № 5/09, генподрядчик – ОАО «Монолит».

Прием и регистрация заявлений на участие в долевом строительстве нежилых помещений будет осуществляться в каб. 401 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

И.о. генерального директора Г.Г. Лапаник

ОАО «Лидапищеконцентраты» (г. Лида, ул. Тавлая, 11)

сообщает, что 20 сентября 2010 года в 14.00 в помещении актового зала, расположенного по адресу: г. Лида, ул. Тавлая, 11, состоится внеочередное собрание акционеров

Повестка дня:

1. Об увеличении Уставного фонда.
2. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.

Место проведения собрания: г. Лида, ул. Тавлая, 11.
Время начала проведения собрания — 14.00.
Регистрация участников собрания с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.
Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества — паспорт, представителю акционеров — паспорт и доверенность. УНП 500021268